11. Kieszkowski, W. Cario Spampani, architekt włoski, czynny w Polsce w XVIII wieku / W. Kieszkowski // Biuletyn Historji Sztuki i Kultury : kwartalnik wydawany przez Zakład Architektury Poiskiej i Historji Sztuki Politechniki.

***М.А. Бабчанок,***
Мінск, Беларусь

# СІСТЭМА БЕЛАРУСКАГА АБРАДАВАГА КОМПЛЕКСУ

*The concept as a rite of certain behaviors and beliefs of man, highlights the main aspects for the classification of types of ritual. The system Belarusian ritual complex, the following groups: calendar, family, occasional ceremonies.*

Абрады і звычаі замацоўваюць дасягненні асабістага і грамадскага жыцця, яны з'яўляюцца сродкам стабілізацыі, перадачы новым пакаленням і адлюстравання ў жыцці міжасабовых і грамадскіх адносін. Устойлівасць абрадаў забяспечвае захаванне для будучых пакаленняў дасягненняў духоўнай культуры, лепшых узораў працы, эталонаў дзеянняў, пачуццяў. Таму вывучэнне беларускай абраднасці з'яўляецца важнай задачай беларускай фалькларыстыкі.

Для гістарычнага развіцця чалавецтва характэрна тое, што вераванні, маральна-этычныя нормы, правілы, погляды, спосабы вядзення гаспадаркі, якія б забяспечвалі дабрабыт кожнага чалавека і грамадства ў цэлым, назапашваліся ў пэўную сістэму, фарміруючы сацыяльны вопыт, перадаваліся з пакалення ў пакаленне і ўсведамляліся як неабходныя на ўзроўні грамадскай свядомасці. Гэтая сістэма ўяўляла сабой сукупнасць дзеянняў, слоў, рухаў, магічных сімвалаў, знакавых элементаў, якія схематычна адлюстроўвалі вераванні чалавека і ажыццяўляліся паводле формульнага прынцыпу. Усе гэта на ўзроўні падсвядомага павінна было садзейнічаць дабрабыту чалавека, што абумоўлівала канстантнасць выканання і забяспечвала ўстойлівае захаванне і пераемнасць зместу, характару, форм пэўных працэсаў і з'яў асабістага і грамадскага жыцця.

Сістэма вызначаных форм паводзін і вераванняў чалавека, якая ўяўляе сабой формулу выканання сімвалічна-знакавых дзеянняў і тэкстаў, традыцыйнасць якой абумоўлівае месца правядзення, выбар выканаўцаў і атрыбутаў, а таксама накіравана на пэўны аб'ект, праводзіцца ва ўстаноўлены час і мае акрэсленае функцыянальнае значэнне, з'яўляецца абрадам. Ён уяўляе сабой своеасаблівую цырымонію, якая рэгламентавана правіламі і нормамі, прынятымі грамадствам і замацаванымі ў доўгачасовым карыстанні. У царкоўнай традыцыі – гэта рэлігійнае дзейства, якое ажыццяўляецца веруючымі з рознымі мэтамі, гэта ўсё тое, што можна аднесці да знешняга боку рэлігійнага жыцця: чыны, прадметы і дзеянні, якія маюць сімвалічнае значэнне. Такім чынам, цар-

коўны абрад – гэта знешняе выяўленне веры чалавека. Таму станаўленне і развіццё царквы садзейнічала змяненню царкоўных абрадаў, якія дапаўняліся, скарачаліся, пры гэтым захоўваючы веру нязменнаю.

У народнай традыцыі абрады з'яўляліся неабходным кампанентам жыцця, яны суправаджалі чалавека ва ўсіх сферах жыццядзейнасці і асэнсоўваліся як дзеянні, якія фактычна могуць стварыць падзею. Напрыклад, вяселле садзейнічала стварэнню новай сям'і, выкананне абрадавых дзеянняў Гукання вясны павінна было забяспечыць абуджэнне прыроды, разрыванне сланечніка па сімвалічным падабенстве ўплывала на разыходжанне хмараў і г. д. [1].

Паняцце «абрад» даволі часта пераклікаецца з больш шырокім паняццем «звычай», якое вызначае любыя дзеянні, якія паўтараюцца і замацаваныя традыцыяй. У складзе абраду можна выдзеліць вызначаныя сімвалічныя дзеянні, якія маюць найбольш архаічную форму або значэнне і, у некаторых выпадках, храналагічна папярэднічаюць абраду. Абрад складаецца з асобных рытуалаў, што ўяўляюць сабой замацаваную традыцыяй паслядоўнасць сімвалічна значных дзеянняў. Такім чынам, рытуал у складзе абраду з'яўляецца сістэмай звыклых сімвалічных дзеянняў, што паўтараюцца і арганізаваны ў адпаведнасці з пэўным парадкам. Абрадавы комплекс беларускага народа ўяўляе сабой сістэму абрадаў і звычаяў, рэгулюемых жыццём чалавека і ўвасобленых у яго светаўяўленні. Асновай жыццядзейнасці чалавека з'яўлялася аграрная гаспадарка, якая заснавана на зладжанай сістэме народных ведаў. Вялікае значэнне мела захаванне і перадача ад пакалення да пакалення працоўных і бытавых ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама звычаяў, абрадаў, сімволіка-знакавых дзеянняў, павер'яў, звязаных з асноўнымі жыццёвымі сферамі: сям'ёй, працай, узаемаадносінамі з іншымі членамі грамадства.

Сістэматызацыя беларускіх абрадаў, рытуалаў і звычаяў садзейнічае больш глыбокаму вывучэнню чалавечага вопыту, захаванага ў традыцыйнай культурнай спадчыне беларусаў. Выдзяленне абрадавых тыпаў можа быць заснавана на розных фактарах. Напрыклад, К. Чыстоў вызначае іх разнастайныя варыянты: эмпірычная форма магічных сродкаў і спосабаў, мэтанакіраванасць абрадавых дзеянняў, умовы выканання, склад і сацыяльны статус выканаўцаў абрадаў, час правядзення, спосаб арганізацыі абрадавай прасторы, характар сувязі разнастайных відаў абрадаў і г. д. [2, с. 103–105]. Рускі даследчык К. Логінаў звяртае ўвагу на магчымасць выдзялення тыпавых груп абрадаў у залежнасці ад складу выканаўцаў («асабістыя», «групавыя», «абшчынныя»), ад полу і ўзросту людзей («мужчынскія» і «жаночыя», «дзіцячыя», «падлеткавыя», «маладзёжныя» і г. д.) [3].

Вызначэнне класіфікацыі беларускай абраднасці можа быць заснавана на асаблівых прыкметах розных кампанентаў абрадаў і звычаяў, аднак найбольш фундаментальным з мэтай сістэматызацыі з'яўляецца выдзяленне абрадавых відаў па наступных аспектах.

1. Аб'ект абрадавага дзеяння – вызначэнне тыпу абраднасці знаходзіцца ў пэўнай залежнасці ад галоўнага аб'екта абраду, спецыфіка якога рэгулюе наяўнасць тых ці іншых абрадавых кампанентаў і звязана з асаблівасцямі функцыянальнай накіраванасці абраду ў цэлым. Аб'ект абраду ўяўляе сабой чалавека, жывую істоту, прыродную з'яву, прадмет і іншае, усё тое, на што накіравана абрадавае ўздзеянне (магічныя або сімвалічныя дзеянні, тэксты, выкарыстанне атрыбутаў і г. д.).
2. Час правядзення абраду – аднясенне абрадавых дзеянняў да пэўнага тыпу залежыць ад іх часавай прымеркаванасці. Абмежаванні часу правядзення абраду маюць вялікае значэнне для большасці беларускіх абрадаў, гэта адносіцца да вызначэння часу сутак (поўдзень, поўнач, раніца, вечар і г. д.), дзён тыдня, квадры месяца, пары года ці канкрэтнай каляндарнай даты або звязана з наступленнем пэўнага жыццёвага этапу.
3. Функцыянальная накіраванасць – вызначэнне тыпу абраду цесна звязана з тымі функцыямі і мэтавымі ўстаноўкамі, якія ставяцца пры яго правядзенні. Абрадавы комплекс мае некалькі агульных функцый – «кансалідуючыя, камунікатыўныя, мабілізуючыя, магічныя, выхаваўчыя, мастацка-эстэтычныя» [4, с. 11]. Аднак кожны канкрэтны абрад, накіраваны на вырашэнне пэўных задач, мае асабістае прызначэнне ў народным жыцці, што вызначае спецыфіку яго правядзення. Падабенства функцый абрадавых сродкаў садзейнічае пераходу іх з аднаго абраду ў іншы. Прыкладам можа стаць ачышчэнне вадой у купальскіх абрадах, а таксама ў абрадах, накіраваных супраць засухі, і інш. Спецыфіка вышэйназваных фактараў у складзе канкрэтнага абраду дазваляе вылучыць асноўныя тыпы абраднасці. Сістэма беларускай абраднасці ўключае наступныя групы абрадаў.

*Каляндарныя* – абрады, якія ўяўляюць сабой наладжаную сістэму народных ведаў, звычаяў, сімвалічных дзеянняў і рытуалаў і заснаваны на гадавым народным календары, на вызначанай сістэме «свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, ігрышчаў, пэўных дзён забарон, што замацаваны ў быце і фальклоры беларусаў праз спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх кампанентаў і з'яўляюцца арыенцірам пры выкананні сельскагаспадарчых работ і адпачынкаў у гадавым, сезонным, месячным цыклах» [5, с. 20–21].

*Сямейныя* – абрады, якія вызначаюць асноўныя жыццёвыя цыклы, звязаныя з пэўнай зменай сацыяльнага статусу ў традыцыйным грамадстве. Самыя вызначальныя этапы ў жыцці чалавека суправаджаліся працяглымі рытуаламі, накіраванымі на «захаванне і працяг роду, паляпшэнне дабрабыту, ушанаванне продкаў, забеспячэнне перамогі добрых духаў» [4, с. 364].

Аднак сярод вышэйназваных груп можна асобна вылучыць абрады, якія адрозніваюцца спецыфічнымі асаблівасцямі. *Аказіянальныя* (лац. occasionaiis – выпадковы) – гэта абрады, якія ўзнаўляюцца ў быце не рэгулярна, а толькі пры

неабходнасці ці ўзнікненні асаблівых, часцей крытычных, крызісных акалічнасцяў. Аказіянальная абраднасць характарызуецца своеасаблівым часам выкання (па неабходнасці) і накіравана на магічнае ўздзеянне на прыродныя і «іншыя» сілы з мэтай змянення крытычнай сітуацыі ў жыцці соцыуму.


***Літаратура***

1. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре / А.К. Байбурин. – Рос. АН, Музей антропологии и этнографии им. Петра Великого (Кунсткамера). – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.
2. Чистов, К.В. К классификации обрядов жизненного цикла / К.В. Чистов // Язычество восточных славян. – Л. : Наука, 1990. – С. 101–107.
3. Логинов, К.К. Обряды традиционные [Электронный ресурс] / К.К. Логинов // Vottovaara. Портал людей знания. – 2005. – Режим доступа : http://www.vottovaara.ru/karelia/obrad/obrady.html. – Дата доступа : 24.12.2013.
4. Народная культура Беларусі : Энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.
5. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар / А.Ю. Лозка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Полымя, 2002. – 240 с.



***М.А. Ващенко,***

Киев, Украина


# ХУДОЖНИК-МОНУМЕНТАЛИСТ ВЛАДИМИР ФЕДЬКО – ОСНОВНЫЕ ЭТАПЫ ТВОРЧЕСТВА


*The article provides a brief analysis of muralist Fedko's heritage. The author pays attention to the tapestry series, works in painting and monumental decorative sphere works of the artist, focuses on complex object - the subway station «Golden Gate» in Kiev. The author also examines the role of the artist in the formation of a national aesthetic perception in post-communist Ukraine.*


При внимательном изучении творческой деятельности художника обращаешь внимание на его ранний поиск собственного художественного идеала, который формируется на уважении к творчеству М. Бойчука и художников его окружения, в их единстве с эстетикой византийского и украинского искусства. На фундаменте этих выдающихся явлений мировой культуры формируется собственный опыт художника.

Образование В. Федько получил на отделении художественного текстиля Львовского государственного института прикладного и декоративного искус-